жр 3175
07/281
Бібліятэка АН БССР

СМЕРЦЬ НЯМЕЦКІМ АКУПАНТАМ!

# Чырвоны сцяг

ОРГАН СВІРСКАГО РК КП(б) БЕЛАРУСІ

№ 25 КАСТРЫЧНІК 1943 г.

Прачытаў---перадай другому.

ГЕРАІЧНАЯ ЧЫРВОНАЯ АРМІЯ ПАБЕДАНОСНА НАСТУПАЕ ПА УСЯМУ ФРОНТУ, АЧЫШЧАЯ НАШУ РОДНУЮ БЕЛАРУСКУЮ ЗЕМЛЮ АД ФАШЫСЦКАЙ ПОГАНІ. БЛІЗАК ЧАС НАШАЙ ПЕРАМОГІ НАД ВОРАГАМ!

ПАРТЫЗАНЫ І ПАРТЫЗАНКІ! УЗМАЦНІМ УДАРЫ ПА ВОРАГУ З ТЫЛА, ДАПАМОЖАМ ЧЫРВОНАЙ АРМІІ ХУТЧЭЙ РАЗГРАМІЦЬ ЗАКЛЯТАГА ВОРАГА!

## Настаў час расплаты.

Пад магутнымі ударамі савецкіх войск, банды людаеда Гітлера адступаюць назад, на захад. Чырвоная армія ўступіла ў прадзелы Беларусі і паспяхова ачышчае гарады і вёскі ад нямецка-фашысцкай навалачы. Воіны Чырвонай арміі ўжо вызвалілі з нямецкай няволі дзесяткі гарадоў Магілёўшчыны, тысячы вёсак Гомельскай і Віцебскай абласцей.

Адступаючы на захад, заклятыя вораг імкнецца як мага больш разарыць, апустошыць наш край. Немцы разбураюць і паляць нашы гарады і вёскі, грабяць наша краўнае багацце, хлеб, жывёлу, маёмасць. Нямецкія злыдні ўсё награбленае цягнуць у сваё фашысцкое логава, у Германію.

Тысячы савецкіх грамадзян немцы забралі і увялі на катаргу. Там іх чакае голад і смерць. Забраные нядаўна ў Мядзельскім, Відзаўскім і Пастаўскім раёнах савецкія людзі паміраюць з голаду ў Пастаўскім лагеры.

Але час расплаты з нямецкімі гадамі настаў! За ўсе крывавые злачынствы подлые немцы адкажуць сваёй чорнай сабачай крывёю.

Партызаны і партызанкі! Нямецкія ката хочуць разарыць наш родны край, знішчыць савецкіх людзей і угнаць іх у фашысцкое рабства.

Не дадзім гітлераўцам выканаць свае намеры, адстаім наш край ад разбою, а савецкіх людзей спасём ад угона на катаргу ў Германію,

На кожным кроку смяротным боем будзем біць нямецкую гадзіну!



Партызаны і партызанкі! Мацней агонь па ворагу з тылу уперад за нашу Перамогу!

## По радзімай краіне.

### 300 урачоў для вызваленых раёнаў Беларусі

Наркомахова здароў'я СССР накіраваў для работы ў вызваленых ад нямецка-фашысцкіх акупантаў раёнах Беларусі 300 урачоў. Урачы выехалі на работу ў амбулаторыях, больніцах, якія адкрываюцца ў раённых цэнтрах і на урачэбных участках.

Жср 3175



## РАЗГРОМЛЕН НЯМЕЦКІ ГАРНІЗОН

Аб'яднаные партызанскія атрады тов. С. і тов. Ж. правялі удачную аперацыю ка разгрому нямецкага гарнізона ў мястэчку Ш.

Вечарам партызаны былі ў поўнай баявой гатоўнасці. Па сігналу камандзіра, народные мсціўцы варваліся ў распалажэнне нямецкага гарнізона. У хатм, дзе заселі паліцейскія, пасыпаліся кулі.

Выканаўшы задачу па разгрому нямецкага гарнізона партызаны без страт вярнуліся на сваю базу.

Партызан АЛЕКСАНДРОВ.

## У НАЧНАЙ АПЕРАЦЫІ

Група партызан атрада тав. С. было дадзена баявое заданне—напасці на гарнізон паліцыі ў Д. і разграміць яго.

Партызаны правялі дакладную разведку, устанавілі, дзе стаяць пасты паліцэйскіх і імелася скрытна падысці к гарнізону. Калі ўсё было вадрыхтавана, партызаны вышлі на выкананне задання.

Пад пакровам асенняй ночы народные мсціўцы ваймлі ў гарнізон. Паліцэйскія, не атрыў агня, разбегліся.

Партызаны спалілі маючыеся там стагі жыта, і знішчылі 150 метраў тэлеграфна-тэлефоннай сувязі.

Камандзір узвода ВАНЯ.

## ЭШАЛОНЫ ВОРАГА—ПАД АДКОС

Падрыўнікі партызанскага атрада В. прабраліся да палатна чыгункі каля ст. К. заклаў ... рыўчаткі партызаны сталі чакаць паяўлення поезда.

Паказаўся цягнік—дала знак ... партызан Аляксей Ш. умоўным знакам.

На поўным ходу поезд ускачыў на партызанскія міны і паляцеў пад адкос.

Узняўся пажар. Чуліся енкі фрыцаў.

Разбіта 14 вагонаў, паравоз і 3 платформы з аўтомашынамі. Пад абломкамі вагонаў загінула 52 і ранена 60 немцаў.

АНТОН Б.

## НАГРАБЛЕНЫ ХЛЕБ ЗВЕРНУТ СЯЛЯНАМ

Немцы аграбілі ў вёсцы А. хлеб і накіроўваліся з абозам у гарнізон В. Сяляне паведамілі аб гэтым партызанам і прасілі дапамагчы ім захаваць хлеб.

Партызаны атрада імені Гастэло вышлі ў засаду і адбілі ад немцаў 30 падвод з награбленым хлебам. Хлеб партызаны звярнулі сялянам.

ВАСІЛІЙ С.

## АД СОВЕЦКАГА ІНФОРМБЮРО

Аперацыўная зводка за 23-х-43 г.

23 Кастрычніка нашы войска цалк аўладзелі горадам і чыгуначным вузл МЕЛІТОПАЛЬ—важнейшым буйным ву лом абароны ворага на поўдзённем н рамку. Немцы прыдавалі асаблівае зн чэнне утрыманню гор. МЕЛІТОПАЛЬ мэжы абароны на рацэ Малочная, апошняй пазіцы замыкаючый падход КРЫМУ і паўдзённаму цячэнню р ДНЯПРА.

Паўдзенна і паўдзенно-усходня г КРЕМЕНЧУГ нашы вайска працягвалі в ці наступальныя баі і занялі некал насялёнцых пунктаў, сярод якіх буйн Пушкароўка і Вярховцева.

Паўдзенна гор. Перэяслаўль-Хмельні кі, нашы войска, працягвалі весці бо пашырэнню плацдарма на правым бера Днепра і на асобных вучастках прадвін ліся уперад на некалькі кіламетраў.

На працягу 22 Кастрычніка нашы вой ка на ўсіх франтах падбілі і знішчылі 1 нямецкіх танкаў. У паветраных баях і а нём зенітнай артылерыі збіта 74 самалё ворага.

Нашы войска на працягу 24 Кастрычн ў районе горада МЕЛІТОПАЛЬ працяг лі пашыраць прарыў, абароны праціўн і аўладзелі некалькімі моцна умацаван мі пунктамі і 3-мя умацаванымі станцыям

На Крыва-Рогскім напрамку нашы вой ка працягвалі наступовые баі і прадвін ліся адз да 10 кіламетраў, занялі звыш насялёных пунктаў, сярод якіх шмат кр ных, у тым ліку ЛАЗОЎКА і 4 чыгун ных станцыі.

На поўдзень ад Рэчыцы нашы часці в лі баі па пашырэнню плацдарма на пр вым берагу ракі ДНЕПР і заўладзелі шмат буйнымі насялёнымі пунктамі.

## Новыя бандыцкія ўчынкі ворага.

Нямецкія акупанты прынеслі ў наш край смерць і дзікія зверствы над мірным насельніцтвам.

Адступаючы люты вораг імкнецца ўсё аніштожыць на сваім шляху. Узвярэкнай нянавісці савецкага народа гітлераўцы імуць на любые зверства і здзекі над мірным насельніцтвам.

Дайшло ўжо да таго, што нямецкія звяры загадалі сялянам Пастаўскага і Мядзельскага раёнаў закапваць озымія пасевы. Пад пагрозай смертнай кары, гітлераўцы прымушаюць сялян знішчыць свой будучы ўраджай.

Таварышчы сяляне і сялянкі! Не давайце гітлераўцам выканаць іх зверскія намеры. Хавайце ад немцаў хлеб, маёмасць, і жывёлу.

Хавайце плугі, бароны і другія сельскагаспадарчы інвентар каб немцы не скарысталі яго назаворванне жыта.

Не пападайцеся немцу у рукі, бо там вас чакае голад і смерць. Рабіце сабе землянкі ў лесах і хавайцеся там ад нямецкага звера.

С.

РЕДАЦЕЙНАЯ КАЛЕГІЯ.